# ЧЫСТАЯ ГУЛЬНЯ

### У спорце без допінгу ў нас больш шанцаў на медалі

**Учора Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка правёў нараду аб ходзе падрыхтоўкі беларускіх спартсменаў да Алімпійскіх гульняў у Рыа-дэ-Жанэйра.**

«Спорт — гэта вялікая палітыка. Вы бачыце, што адбываецца цяпер, якая ідзе барацьба. Напэўна, усё ж такі нейкі палітычны падтэкст у гэтым ёсць. Калі мы з гэтымі допінгамі сваволілі, то мала не падасца. Я абсалютна за чысціню спорту, — падкрэсліў Прэзідэнт. — Калі нехта прымае забароненыя прэпараты, то з гэтым трэба змагацца. І нам гэта выгадна. Калі мы не будзем прыхільнікамі чыстага спорту, мы прайграем. Таму што вялікія дзяржавы заўсёды знойдуць магчымасць нас у гэтым перайграць. Калі чысты спорт, у нас больш магчымасцяў заваяваць медалі».

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што для спорту, у першую чаргу спорту вышэйшых дасягненняў, у Беларусі робіцца ўсё неабходнае. «Не думаю, што нехта можа сказаць, што не хапіла нейкіх сродкаў, каб падрыхтавацца да Алімпіяды», — сказаў беларускі лідар.

Разам з тым Прэзідэнт падкрэсліў, што «турыстаў» Беларусь у Бразілію не павязе. Ён пацікавіўся, у якіх відах спорту ў нацыянальнай каманды ёсць рэальныя шанцы на дастойнае выступленне, якая колькасць і якасць ліцэнзій. «Усе мы разумеем, што на Алімпіядзе слабых сапернікаў не бывае. З кожным годам усё складаней заваёўваць медалі. Але гэта не падстава для апраўданняў, — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. — Мы адышлі ад практыкі канкрэтных медальных планаў. Напэўна, гэта правільна. Не трэба залішне ціснуць на спартсменаў. Аднак калі мы бачым, што шанцаў няма, нясласвіць краіну і траціць народныя грошы не трэба». Аляксандр Лукашэнка таксама выказаў заклапочанасць у сувязі з тым, што адбываецца ў свеце на фоне і вакол Алімпійскіх гульняў. «Усе мы сочым праз СМІ за тым, што спорт пераходзіць у вялікую палітычную плоскасць. Гэта датычыцца і допінгавых пытанняў, асабліва мельдонію, які стаў раптоўна сусветна вядомым. У сувязі з гэтым важна ведаць, ці закранула гэта праблема нашых спартсменаў і наколькі. Утойваць нічога не трэба», — сказаў Прэзідэнт.

У Нацыянальным алімпійскім камітэце кіраўніку дзяржавы прэзентавалі парадную і спартыўную форму для беларускай спартыўнай дэлегацыі на Алімпіядзе.

## Удасканальваюцца парадак і ўмовы стымулявання прадпрымальніцкай дзейнасці ў вёсцы

**У Беларусі ўдасканальваюцца парадак і ўмовы стымулявання прадпрымальніцкай дзейнасці на тэрыторыі сярэдніх, малых гарадскіх паселішчаў і сельскай мясцовасці.**

Гэта прадугледжана дэкрэтам № 2 «Аб унясенні дапаўненняў і змяненняў у дэкрэты Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь», які кіраўнік дзяржавы падпісаў 27 чэрвеня, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага лідара. Дакументам, у прыватнасці, карэкціруюцца асобныя нормы дэкрэта ад 7 мая 2012 года № 6 «Аб стымуляванні прадпрымальніцкай дзейнасці на тэрыторыі сярэдніх, малых гарадскіх паселішчаў, сельскай мясцовасці».

Дэкрэтам прадугледжана распаўсюджванне дзеючых падатковых ільгот на дзейнасць прадпрыемстваў — рэзідэнтаў свабодных эканамічных зон (СЭЗ), размешчаных на гэтых тэрыторыях сярэдніх, малых гарадскіх паселішчаў і сельскай мясцовасці; філіялаў (адасобленых падраздзяленняў), якія выконваюць падатковыя абавязацельствы арганізацый, прымяняюць адзіны падатак для вытворцаў сельскагаспадарчай прадукцыі (у частцы дзейнасці, на якую не распаўсюджваецца адзіны падатак).

Дэкрэтам таксама прадастаўлена магчымасць павелічэння статутнага фонду камерцыйнай арганізацыі не толькі за кошт укладу яе заснавальнікаў, але і за кошт тавару, набытага самой арганізацыяй.

У мэтах стымулявання ўключэння ў гаспадарчы абарот неэфектыўна выкарыстоўваемай маёмасці адмяняецца льгота па падатку на нерухомую маёмасць адносна гэтай маёмасці.

# КРОКІ НАСУСТРАЧ

### Наша краіна гатова ствараць у Тайландзе сумесныя прамысловыя прадпрыемствы

**Аб гэтым кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка заявіў на сустрэчы са старшынёй Нацыянальнага заканадаўчага сходу Тайланда Панпечам Вічытчалчаем.**

«Мы гатовы да стварэння на тэрыторыі Тайланда сумесных прадпрыемстваў па вытворчасці патрэбнай вам прадукцыі, асабліва прадукцыі машынабудавання. Мы гатовы пастаўляць вам прадукцыю і гатовы закупляць у Тайландзе тыя тавары, якія патрэбны нам, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Але для таго, каб рабіць адпаведныя крокі ў гэтым кірунку, патрэбна глыбокая прапрацоўка пытання».

Кіраўнік дзяржавы растлумачыў, што краінам неабходна падрыхтаваць адпаведную дагаворна-прававую базу. «Гэта значыць патрэбны базавыя дакументы для ўзаемнага гандлю. І некаторыя праекты дакументаў знаходзяцца ў вас на разглядзе. Мы і вы ведаем, што трэба сёння рабіць, і трэба пачынаць гэтыя крокі», — упэўнены Прэзідэнт.

Супрацоўніцтва паміж Беларуссю і Тайландам пачалося менавіта з заканадаўчых галін улады. «Мы будзем арыентавацца на тое, што ў Беларусі менавіта парламент будзе галоўным накіроўваючым звяном у нашых адносінах. Але я як кіраўнік дзяржавы зраблю ўсё для таго, каб нашы адносіны развіваліся і паглыбляліся», — запэўніў беларускі лідар. Прэзідэнт Беларусі дадаў, што краіны распрацавалі дарожную карту адносін. «Я не скажу, што гэта канчатковы варыянт, думаю, што мы над планам нашых адносін будзем і далей працаваць, паглыбляць і пашыраць іх, асабліва ў сферы эканамічнага супрацоўніцтва, таму што гэта фундамент любых адносін», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.'

Старшыня Нацыянальнага заканадаўчага сходу Тайланда выказаў надзею, што Прэзідэнт Беларусі будзе і ў далейшым падтрымліваць умацаванне адносін паміж дзвюма дзяржавамі, паведамляе БЕЛТА.

# ГРОШЫ. НОВЫЯ. І БЕЗ ВАРЫЯНТАЎ

### Новыя грошы — у пятніцу пасля 8 раніцы

Ужо на працягу некалькіх дзён банкі пачалі публікаваць адрасы банкаматаў, у якіх 1 ліпеня можна будзе зняць новыя грошы. Нагадаем, у першыя дні пасля дэнамінацыі банкноты без нулёў плануюць загрузіць у кожны трэці банкамат. Акрамя гэтага, Нацбанк запэўніў, што да 1 кастрычніка на новыя грошы пяройдуць усе без выключэння банкаматы.

Спісы банкаматаў, у якіх можна зняць грошы ўзору 2009 года (гэта значыць дэнамінаваныя), банкі павінны будуць публікаваць на сваіх сайтах і абнаўляць іх у рэжыме рэальнага часу ўжо з першых гадзін сваёй работы.

З новымі грашыма больш за ўсіх пашанцуе кліентам Беларусбанка (і банкаў-партнёраў). Банкаматы гэтага банка не будуць працаваць толькі з 23.30 апошняга дня чэрвеня і да 8.00 першага ліпеня. Плануецца, што гэтыя прылады будуць выдаваць грашовую наяўнасць толькі ўзору 2009 года. Плануецца, што загрузка ўсіх банкаматаў банкнотамі ўзору 2009 года з абавязковай загрузкай банкнотамі наміналам 5 рублёў будзе забяспечана да канца дня 1 ліпеня. Але ў першую чаргу загрузяць тыя прылады, якія карыстаюцца павышаным попытам у кліентаў — каля 120 банкаматаў у Мінску і вобласці.

Асобна трэба адзначыць, што банкаматы не могуць адначасова выдаваць новыя і старыя грошы. А манеты банкаматы не будуць выдаваць ніколі. Самымі папулярнымі купюрамі, якія будуць выдаваць банкаматы, стануць 5 і 10 рублёў (эквівалент цяперашніх 50 і 100 тысяч). А вось самыя буйныя новыя купюры — 200 і 500 рублёў у банкаматы запраўляць не будуць, бо іх увогуле можна будзе атрымаць у банку толькі пасля папярэдняга заказу.



### Ноч з наяўнымі

Практычна ўсе банкі Беларусі гэтымі днямі папярэджваюць сваіх кліентаў аб тым, што з вечара чацвярга і да раніцы пятніцы іх плацежныя карткі працаваць не будуць. У гэты час нашым «пластыкам» нельга будзе разлічыцца ні на тэрыторыі дзяржавы, ні за яе межамі. Напрыклад, карткі Беларусбанка часова перастануць выконваць функцыі плацежнага сродка з 23.30 у чацвер да 8.00 пятніцы. Таму спецыялісты рэкамендуюць загадзя зняць пэўную суму наяўных, якая можа спатрэбіцца на бягучыя выдаткі ў гэты перыяд. Толькі без фанатызму, бо шмат гатоўкі ў кішэнях даволі хутка знікае...

Падобнае тычыцца і магазінаў, аб'ектаў грамадскага харчавання і бытавога абслугоўвання насельніцтва, рэжым працы якіх доўжыцца і пасля 24.00. Гэтым пунктам дазволілі самастойна зачыняцца ўначы на пятніцу, або перайсці на абслугоўванне па наяўным разліку.

Аналітыкі амаль упэўнены, што буйныя крамы ў спальных раёнах вялікіх гарадоў краіны ў гэтую ноч у большасці вырашаць зрабіць перапынак і лепш падрыхтавацца да работы ў новых умовах. А вось знакавыя кафэ і рэстараны будуць працаваць па «наяўным» варыянце ажно да раніцы ці да апошняга кліента.

### Тэлефон і інтэрнэт

Аналітыкі паведамляюць, што ў штатным рэжыме без збояў інтэрнэт-банкінг і іншыя сістэмы дыстанцыйнага абслугоўвання будуць працаваць максімум да 16-17 гадзін 30 чэрвеня. А вечарам (з 23.00) банкі дружна пачнуць пераўсталёўваць праграмнае забеспячэнне і «выкрэсліваць» нулі на нашых рахунках. Многія адновяць работу сваіх сістэм толькі раніцай у панядзелак. Таму за тэлефон, інтэрнэт і іншыя паслугі лепш заплаціць у аўторак або сераду, чым цягнуць з аплатай да абеду чацвярга. Да таго ж, трэба ўлічваць, што ў гэтыя дні і банкаўскія аддзяленні таксама будуць працаваць па спецыяльным рэжыме.

Лепш своечасова аплаціць і падаткі — адзіны падатак для індывідуальных прадпрымальнікаў, а таксама за здачу кватэры. Разлічыцца з бюджэтам патрэбна да 1 ліпеня ўключна. Але падатковая папярэдзіла: з прычыны спецыяльнага рэжыму работы банкаў плацяжы могуць не прайсці, а саступак з-за дэнамінацыі рабіць не будуць — адразу налічаць пеню.

### Валюта і аўтааплата

Большасць абменнікаў краіны да 4 ліпеня будзе працаваць у падкарэктаваным рэжыме. Таму калі вам трэба здаць або купіць валюту, зрабіць гэта лепш да 30 чэрвеня. Тым больш што з чацвярга і па 3 ліпеня ўключна таргі на валютнай біржы праводзіцца не будуць, а гэта значыць, што і курс у гэтыя чатыры дні не зменіцца.

Абавязкова неабходна падстрахавацца і тым, у каго дзейнічае сэрвіс «Аўтааплата», калі грошы за пэўныя паслугі спісваюцца з рахунку аўтаматычна. Такім кліентам лепш загадзя звярнуцца менавіта ў свой банк, каб атрымаць дакладную інструкцыю аб тым, што трэба рабіць, каб і надалей карыстацца такой паслугай. Справа ў тым, што ў некаторых выпадках паслугу прыйдзецца пераафарміць, а для гэтага трэба будзе пад'ехаць у банкаўскае аддзяленне. Акрамя таго, калі нейкія плацяжы ў сэрвісе «Аўтааплата» настроены на апошні ці першы дзень месяца, то ёсць верагоднасць, што яны могуць не прайсці.

**Сяргей КУРКАЧ.**
kurkach@zviazda.by

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

■ Парламенцкі дзённік

# ПЕРСПЕКТЫВА ЁСЦЬ, АЛЕ ПАТРЭБНЫ ДАКУМЕНТЫ

**У рамках дзелавога візіту старшыня Нацыянальнага заканадаўчага сходу Тайланда Панпеч ВІЧЫТЧАЛЧАЙ сустрэўся са старшынёй Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Уладзімірам АНДРЭЙЧАНКАМ і старшынёй Савета Рэспублікі Міхаілам МЯСНІКОВІЧАМ. Абмяркоўваўся шэраг пытанняў, якія тычыліся пашырэння супрацоўніцтва ў сферы эканомікі, гандлю, лагістыкі і турызму.**

Міхаіл Мясніковіч выказаў меркаванне, што Беларусь зацікаўлена ў выбудоўванні роўных партнёрскіх адносін з Тайландам. Ён адзначыў, што з візітам тайландскіх гасцей беларускі бок звязвае вялікія перспектывы. Аднымі з найважнейшых для беларусаў кірункаў з'яўляюцца ўзгодненая палітыка ў рабоце міжнародных арганізацый і ўмацаванне двухбаковых сувязяў. У сваю чаргу Уладзімір Андрэйчанка адзначыў, што Беларусь разглядае Тайланд як перспектыўнага партнёра ў рэгіёне Паўднёва-Усходняй Азіі і гатова займацца кааперацыяй па ўсім спектры двухбаковых адносін. Гэтаму таксама спрыяюць міжпарламенцкія адносіны, якія, на думку Уладзіміра Андрэйчанкі, апошнім часам вельмі інтэнсіўна развіваюцца. Таксама старшыня Палаты прадстаўнікоў звярнуў увагу і на рэгулярныя двухбаковыя сустрэчы і ўзаемадзеянне груп дружбы.

Па выніках сустрэчы старшыня Палаты прадстаўнікоў паведаміў, што ў Тайландзе ўжо ў найбліжэйшы час плануецца адкрыць ганаровае консульства Беларусі. Зусім нядаўна адкрылася аналагічнае ганаровае консульства Тайланда ў Беларусі. Акрамя таго, па словах спікера, на сустрэчы абмяркоўваліся пытанні спрашчэння візавага рэжыму для беларускіх грамадзян.

У сваю чаргу Міхаіл Мясніковіч выказаў упэўненасць у далейшым развіцці беларуска-тайландскіх адносін. Аднак для гэтага дзвюм краінам неабходна дапрацаваць дагаворна-прававую базу, якая яшчэ фактычна знаходзіцца на пачатковай стадыі фарміравання.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.**
*Kryzhevich@zviazda.by*

■ Надвор'е

# ПАСВЯЖЭЕ, АЛЕ НЕНАДОЎГА

**На тэрыторыю Беларусі ў панядзелак прарваўся халодны фронт, які прынёс свежае паветра з паўночнага захаду Еўропы, паведаміў начальнік службы гідраметэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага гідраметцэнтра Дзмітрый РАБАЎ.**

Таму сёння тэмпературны фон ужо знізіўся. На працягу дня будзе пераважна без ападкаў, толькі па ўсходзе краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы і навальніцы, а пры іх, месцамі, моцныя ліўні і шквалістае ўзмацненне ветру парывамі да 15—20 м/с, у асобных раёнах магчымы град. Максімальная тэмпература паветра ўдзень будзе вагацца ад плюс 20 градусаў па поўначы, да 28 цяпла па поўдні краіны. У сераду будзе пераважна без ападкаў, толькі па ўсходзе месцамі кароткачасовыя дажджы і навальніцы. Тэмпература паветра ўначы складзе плюс 12—19 градусаў, а ўдзень — 22—29 цяпла.

Надалей у чацвер на тэрыторыю краіны зноў завітаюць вельмі цёплыя паветраныя масы з боку Міжземнага мора, і тэмпература пачне павялічвацца. Толькі ў асобных раёнах пройдуць кароткачасовыя дажджы і навальніцы. Тэмпература паветра ўначы складзе плюс 12—18 градусаў, удзень чакаецца 25—30 цяпла, а па паўднёвым захадзе — да плюс 32 градусаў. Сіноптыкі прагназуюць, што і пачатак ліпеня таксама будзе гарачым. Так, у пятніцу 1 ліпеня, пераважна па паўночна-заходняй палове Беларусі чакаюцца кароткачасовыя дажджы. Нават мінімальная тэмпература паветра ўначы складзе плюс 13—20 градусаў, а максімальная ўдзень будзе дасягаць 25—30 цяпла, па паўднёвым усходзе — да плюс 32 градусаў.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных спецыялістаў, у выхадныя дні на фоне высокага атмасфернага ціску будуць праходзіць малаактыўныя атмасферныя франты, якія прынясуць месцамі кароткачасовыя дажджы. Захаваецца гарачае і сухое надвор'е, і тэмпература паветра ўначы будзе вагацца ад 13 да 20 цяпла, а ўдзень будзе плюс 24—29 градусаў, па поўдні — 30—32 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.**
*kurkach@zviazda.by*